# ЗАРЭМБА МІХАСЬ



**Зарэмба Міхась (Міхаіл Мікалаевіч; н. 2.1.1941, в. Знаменка Лагойскага р-на Мінскай вобл.), празаік. Член СП Беларусі з 1989. Выдатнік народнай асветы Беларусі (1978).**

Нарадзіўся ў сям'і служачых. Спачатку вучыўся ў Свіднянскай пачатковай, потым у Знаменкаўскай сямігадовай школе. Дзесяты клас закончыў у СШ № 1 г. Лагойска (1957). Пасля працаваў у калгасе. У 1960 паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. На апошнім годзе вучобы пачаў працаваць у газеце «Піянер Беларусі» (працаваў да 1989). З 1989 у выдавецтве «Юнацтва». Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалём.

Пісаць М. Зарэмба пачаў яшчэ ў школе. Першы верш «Ручаёк» надрукаваў у газеце «Піянер Беларусі». Пасля друкаваўся ў газетах «Мінская праўда», «Чырвоная змена», часопісах «Маладосць», «Бярозка». Праца ў калгасе вызначыла тэматыку першых вершаў і карэспандэнцый, дасланых у рэдакцыі. Гэта былі замалёўкі калгаснага жыцця і быту таго часу. Яшчэ студэнтам М. Зарэмба пачаў акрамя вершаў пісаць апавяданні. Творчаму станаўленню празаіка спрыяла сяброўства з А. Сербантовічам, з якім ён разам вучыўся ва універсітэце, потым працаваў у рэдакцыі. Празаічныя жанры паступова выціснулі паэзію. М. Зарэмба знайшоў сябе менавіта ў дзіцячай літаратуры, чаму спрыяла і праца ў піянерскай газеце. Першая кніга «Камандзір зялёнага патруля» выйшла ў 1967. Праз 10 год аповесць «Сакрэт тэлепата» (рукапіс) атрымала другую прэмію на Рэспубліканскім конкурсе, прысвечаным 70-годдзю Кастрычніка. Сваю творчасць аўтар цалкам прысвячае дзецям, бачыць у гэтым свой чалавечы абавязак. Пісьменнік імкнецца гаварыць з юнымі чытачамі шчыра і даверліва, займальна будаваць сюжэт, ствараць жывыя вобразы. Шматлікія камандзіроўкі па рэспубліцы і за яе межы спрыяюць творчаму росту празаіка, дапамагаюць зразумець і асэнсаваць складанасць сучаснага жыцця, праблемы выхавання падрастаючага пакалення, узаемаадносін бацькоў і дзяцей.

Жыве ў Мінску.

*Т. М. Тарасава.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тарасава, Т.М. Зарэмба Міхась / Т.М. Тарасава // Беларускія пісьменнікі : біябібліягр. слоўн. : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы, Акад. навук Рэсп. Беларусь, Беларус. энцыкл. ; пад рэд. А.В. Мальдзіса ; рэдкал.: І.Э. Багдановіч [і інш.]. – Мінск, 1993. – Т. 2. – С. 501.